# ТАЛЕНАВІТЫ АРГАНІЗАТАР

К. ГЛУШАНІН.

Імя Іосіфа Аляксандравіча Адамовіча, аднаго з выдатных дзяржаўных дзеячоў Беларусі, добра вядома працоўным рэспублікі. Гэта быў чалавек невычарпальнай энергіі, непахісны бальшавік-ленінец, бязмежна адданы справе рэвалюцыі і народу.

Нарадзіўся І. А. Адамовіч у 1896 годзе ў Мінску, у сям'і рабочага. Дзяцінства яго было бязрадасным, поўным нястач. Як ні стараўся бацька, пераязджаючы з месца на месца ў пошуках лепшага ў жыцці, але вельмі рана мусіў выправіць сына на свой хлеб. Дванаццацігадовы хлапчук, ледзь паспеўшы скончыць царкоўна-прыходскую школу, пачынае працаваць на гліняна-пасуднай фабрыцы ў Нова-Барысаве.

У маі 1915 года юнака забралі на ваенную службу ў царскую армію і неўзабаве паслалі на Паўднёва-Заходні фронт.



Іосіф Аляксандравіч Адамовіч.

ўдзел у фарміраванні і ўмацаванні воінскіх часцей і хутка яго вылучаюць на пасаду губваенкома. Адначасова Іосіф Аляксандравіч з'яўляецца членам Бюро Смаленскага губкома партыі, некаторы час выконвае абавязкі сакратара гаркома.

У 1918—1920 гг. І. А. Адамовіч узначальваў атрады па барацьбе супраць контррэвалюцыйных мяцежнікаў у асобных раёнах Смаленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Мінскай губерань. Прымаў актыўны ўдзел у барацьбе з белапалякамі за вызваленне роднай Беларусі і Мінска.

З восені 1922 года ён вучыцца ў агульна-вайсковай акадэміі ў Маскве. Але неўзабаве партыя адклікае і накіроўвае яго ў Беларусь, дзе ён прызначаецца Старшынёй Савета Народных Камісараў. На гэтай пасадзе і разгарнуўся арганізатарскі талент І. А. Адамовіча. Ён шмат дбае аб уздыме эканомікі рэспублікі, асвеце, ахове здароўя працоўных і ўмацаванні Савецкай улады на месцах. З самымі надзённымі пытаннямі звяртаюцца да яго людзі.